## *РАЗДЕЛ 2*
## *ТЕОРЕТИКО-МЕТОДОЛОГИЧЕСКИЕ ПРОБЛЕМЫ КУЛЬТУРОЛОГИИ*

# ФІЛАСОФІЯ ГЕГЕЛЯ І ЯЕ ЗНАЧЭННЕ Ў КАНТЭКСЦЕ СУЧАСНЫХ КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

**Бабко А. І.**
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт, дацэнт кафедры філасофіі*
*УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

Феномены культуры могуць (і павінны) разглядацца ў розных светапоглядных каардынатах і на грунце розных метадалагічных падыходаў. (Ідэнтычная сітуацыя мае месца, дарэчы, і пры вывучэнні прыродных з'яў. У дадзенай сувязі дастаткова прыгадаць, якая шырокая палітра філасофскіх прыхільнасцяў выяўляецца ў навукоўцаў, што стаяць ля вытокаў сучаснай фізікі. З іншага боку, іх тэорыі зрабіліся прадметам самых розных філасофскіх інтэрпрэтацый.) На нашу думку, класічная філасофія застаецца ў сучасных умовах цалкам канкурэнтназдольнай у барацьбе за права фігураваць у якасці светапогляднага і метадалагічнага падмурка для культуралагічных даследаванняў. Дадзеная тэза мае, безумоўна, моц і ў дачыненні да такога неардынарнага духоўнага феномена, як філасофская сістэма Гегеля.

У кантэксце метадалагічнага значэння гегелеўскіх ідэй для сучасных культуралагічных даследаванняў адразу паўстае, аднак, у найвышэйшай ступені цікавае і важнае пытанне. Справа ў тым, што згодна з пазіцыяй самога Гегеля сістэматычна распрацаваная і апрабаваная ім спекулятыўная дыялектыка з'яўляецца спецыфічна філасофскай метадалогіяй. Менавіта ў сферы філасофскага пошуку яна можа знайсці плённы ўжытак, бо адпавялае характару і сутнасці задач, што ставяцца тут перад даследчай дзейнасцю. Навуковыя даследаванні, як лічыць філосаф, мусяць грунтавацца на іншым метадалагічным падмурку, звязаным з запачаткаванай Арыстотэлем фармальнай логікай, якая кіруецца прынцыпам несупярэчнасці (гэта амаль усеагульнае бачанне арыстотэлеўскай логікі – альтэрнатыўныя погляды на яе маюць харатар выключэння; тым не менш яны выказваюцца ў навуковай літаратуры [4, с. 71-72]). Варта, дарэчы, адзначыць, што падобную пазіцыю займаў і шмат хто з іншых выдатных філосафаў – напрыклад, Эрых Фром [5, с. 72-79].

У тым, што філасофія ў сваіх рэфлексіўных і інтэпрэтацыйных доследах павінна выяўляць метадалагічную (і не толькі) спецыфіку, з Гегелем неабходна пагадзіцца. Ці адпавядае, аднак, сутнасці і рэальнаму стану рэчаў усталяванне неадольнай мяжы паміж філасофскай і навуковай метадалогіяй? Гісторыя філасофскага і навуковага пазнання адназначна сведчыць на карысць тэзы пра магчымасць і неабходнасць плённага ўзаемадзеяння абедзвюх пазнавальных сфер і ў галіне метадалогіі, і, безумоўна, у іншых адносінах.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Той момант, што навука здольная ўспрыняць дыялектычны метад і можа мець у ім пільную патрэбу, пераканаўча пацвярджаецца фактамі з гісторыі разгортвання навуковага пошуку. Калі разглядаць прыродазнаўчы яго кірунак, дык найперш у дадзеным кантэксце варта згадаць квантавую механіку і філасофскія дыскусіі, што вядуцца вакол яе. Нават вялікі Н. Бор, як указвае нямецкі філасаф-марксіст Х.-Ю. Трэдэр са спасылкай на свае гутаркі з Л. Розенфельдам, "у апошнія гады свайго жыцця ўсё больш цікавіўся дыялектыкай Гегеля і бачыў у ягонай "Логіцы" філасофскі падмурак свайго ў найвышэйшай ступені грунтоўнага для фізікі паняцця дапаўняльнасці" [7, с. 30] (пераклад мой – А.Б.). У абсягу грамадскіх навук яскравым прыкладам запатрабаванасці дыялектычнай метадалогіі з'яўляюцца эканамічныя даследаванні К. Маркса (які, праўда, – наўрад ці правамерна – супрацьпастаўляў сваю дыялектыку гегелеўскай [2, с. 21]).

Перш чым акрэсліць магчымыя кірункі ўжывання дыялектычнага метаду ў яго класічнай, гегелеўскай інтэрпрэтацыі ў галіне культуралагічных даследаванняў, неабходна выявіць асноўныя характарыстыкі прапанаванага вялікім нямецкім філосафам падыходу. Гегель пераканаsuccessfully, што найглыбейшы ўзровень рэальнасці мае дыхатамічную структуру. У сваёй грунтоўнай раздвоенасці дадзены ўзровень выяўляе гэткую сама грунтоўную ўнутраную тоеснасць. Адзінства супрацьлеглых пачаткаў мае рухомы характар, яно разгортваецца, абвастраецца да калізіі, антыноміі, супярэчнасці, каб вырашыцца праз працэс іх яднання на больш высокай аснове, дзе супрацьлегласці робяцца ідэальнымі момантамі новай цэласнасці. Скіраванасць на разгляд рэчаіснасці ў яе жывасці, рухомасці, развіцці, выкліканых яе канкрэтнай, увасобленай у непадзельных і разам з тым супрацьлеглых вызначэннях унутранай натурай, з'яўляецца, значыцца, найважнейшай адзнакай гегелеўскай дыялектычнай метадалогіі.

Такім чынам, сутыкаючыся з грунтоўнымі дыхатамічнымі структурамі пры вывучэнні культурных з'яў і працэсаў, мы можам звярнуцца да гегелеўскай тэарэтычнай схемы іх аналізу і праверыць у рамках даследчай практыкі яе эфектыўнасць. Апроч таго, гаворка павінна весціся тут (як, зрэшты, і ва ўсякім іншым выпадку) не толькі пра магчымыя тэарэтычныя набыткі – надзвычай важна мець на ўвазе і практычныя наступствы тых ці іншых канцэптуальных пабудоў. (Наўрад ці хто будзе сумнявацца ў тым, што распрацаваныя ў абсягу філасофіі культуры і тэарэтычнай культуралогіі канцэпцыі ўплываюць – і пры пэўных умовах уплываюць істотна – на разгортванне культурных працэсаў.)

Калі мы разгледзім у дадзеным кантэксце, напрыклад, праблему ўзаемадачыненняў сучаснай і традыцыйнай культуры, дык дыялектычны падыход нацэліць нас на пошук такіх мадэляў іх адносінаў, у якіх яны фігуравалі б у канчатковым выніку як неад'емныя моманты адзінага дынамічнага цэлага – нацыянальнай (і агульначалавечай) культуры. У гэтым выпадку, дарэчы, мы маем справу яшчэ з адным надзвычай важным для разумення гегелеўскай філасофіі і яе эфектыўнага ўжывання ў канкрэтных навуковых даследаваннях момантам – з катэгорыяй зняцця. У ёй фіксуецца



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

патрабаванне разгляду рэчаісных працэсаў ва ўласцівым ім спалучэнні пераемнасці і зменлівасці. У дачыненні да сферы культуры грунтоўнае значэнне дадзенага патрабавання, узятага і ў тэарэтычным, і ў практычным плане, падаецца відавочным.

Скіраванасць гегелеўскай метадалогіі на вырашэнне супярэчнасцяў у цэласным, сінтэтычным працэсе можа стварыць уражанне, нібыта пры яе паслядоўным ужыванні чалавек, асоба, індывідуальнасць мусіць у канчатковым выніку згубіцца, зрабіўшыся ў сабе і для сябе нязначным момантам высокакаштоўнага цэлага (напрыклад, дзяржаўнага цэлага, на што ўказваў, аналізуючы філасофію Гегеля, Б. Расэл [3, с. 758]; у нашым выпадку гаворка павінна весціся, відавочна, пра культурную цэласнасць). Наколькі правамерным, аднак, з’яўляецца згаданае ўражанне? Неабходнасць дакладнага і пераканаўчага высвятлення дадзенага пытання абумоўліваецца шэрагам фактараў, сярод якіх варта адзначыць наяўнасць няпростых і разам з тым далікатных праблем (як, напрыклад, праблема ўзаемадачыненняў творчай асобы і пэўнай супольнасці, у рамках якой яна мусіць жыць і тварыць), пры вырашэнні якіх дыялектычны падыход можа, як падаецца, прывесці да негатыўных наступстваў і ў тэарэтычным, і ў практычным плане.

У дадзенай сувязі неабходна найперш адзначыць, што думка, згодна з якой чалавек, яго індывідуальнасць, асабовасць павінны знікнуць у рамках нейкай цэласнасці ці супольнасці, была для Гегеля абсалютна непрымальнай (узгадаем ягоную крытыку Платона, які пазбавіў грамадзянаў сваёй ідэальнай дзяржавы свабоднага выбару занятку [1, с. 289]). Філосаф зусім не адбірае ў індывіда права на незалежнае прыватнае жыццё. Разам з тым, аднак, ён фактычна ўказвае ўсім і кожнаму на каласальную складанасць дасягнення чагосьці большага. І ў асаблівай ступені гэта датычыць сучаснага грамадства, у якім прыватныя індывідуальныя інтарэсы і патрэбы абаронены і задаволены, як ніколі раней. Гегель бачыць сучаснасць празаічнай, негераічнай эпохай (хоць туга па гераічным часе ніколі не пакіне нас, нягледзячы на ўсю яе зручнасць і камфортнасць) [6, с. 192-194]. Становішча індывіда ў такіх умовах выглядае супярэчлівым і няпростым. Чалавек, аднак, здольны вытрымаць дадзеную супярэчнасць і зрабіць яе крыніцай свайго самаразвіцця (такая здольнасць з’яўляецца, паводле Гегеля, істотнай характарыстыкай усякага духоўнага ўтварэння).

Тая акалічнасць, што гегелеўская філасофія можа быць эфектыўна задзейнічана ў працэсе даследавання культурных феноменаў, не павінна, безумоўна, разглядацца як аргумент на карысць яе выключнай непагрэшнасці ці як падстава або апраўданне некрытычнага стаўлення да яе. Так, наўрад ці можна прыняць цалкам і поўнасцю прапанаваную філосафам канцэпцыю гістарычнага развіцця чалавецтва, у якой губляецца яго плюральнасць, наяўнасць розных, часам альтэрнатыўных магчымасцяў яго самаздзяйснення (што мае, безумоўна, істотнае значэнне і пры разглядзе гісторыі культуры).

Такім чынам, цалкам апраўданай падаецца выснова, згодна з якой філасофія Гегеля ні ў якім разе не павінна быць адсунутая на задні план у



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сучасным культуралагічным пошуку. Яна і сёння здольная даць даследчыкам надзвычай эфектыўныя інструменты для вядзення тэарэтычных даследаванняў, якія могуць прынесці важкія вынікі і ў практычных адносінах. Каб дасягнуць іх, аднак, неабходна творча і крытычна ставіцца да яе, бяручы пад самую пільную ўвагу тыя ўмовы, у якіх дадзены духоўны феномен можа поўнасцю раскрыць свой велізарны светапоглядны і метадалагічны патэнцыял.

1. *Гегель, Г.В.Ф.* Философия права / Г.В.Ф. Гегель. – М. : Мысль, 1990. – 524 с.
2. *Маркс, К.* Капитал / К. Маркс // Маркс, К., Энгельс, Ф. Соч. – 2-е изд. – Т. 23. – С. 5–907.
3. *Рассел, Б.* История западной философии / Б. Рассел. – М. : Изд-во иностр. лит., 1959. – 935 с.
4. *Bocheński, J.M.* Formale Logik / J.M. Bocheński.–5.Aufl.– Freiburg, Műnchen: Karl Alber, 1996.– 648 S.
5. *Fromm, E.* The Art of Loving: an Enquiry into the Nature of Love / E. Fromm. – New York, Evanston: Harper and Row, 1962. – 146 p.
6. *Hegel,* G.W.F. Ästhetik: in 2 B. / G.W.F.Hegel. – 3. Aufl. – B. 1. – Berlin, Weimar :Aufbau-Verlag, 1976. – 591 S.
7. *Treder, H.-J.* Über Hegels Beziehungen zur Naturwissenschaft / H.-J. Treder Sitzungsber. der Akad. der Wiss. der DDR. Gesellschaftwiss.; Jg.1982, 8/G. – Berlin : Akad. Verl., 1982. – S. 28-30.

# ОСОБЕННОСТИ ХУДОЖЕСТВЕННОГО ОФОРМЛЕНИЯ ВЫСШИХ НАГРАД РУССКОЙ АРМИИ В ПЕРИОД СО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЫ XVII ВЕКА ПО 1917 ГОД

**Бортновская М. С.**
*магистрантка кафедры белорусской и мировой художественной культуры*
*УО «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*
*(Республика Беларусь, г. Минск)*

Исследование высших наград русской армии актуально с точки зрения более точного определения его места в системе искусств. Художественное оформление наград представляет собой систему уникальных техник и художественных приемов оформления, которое исполняет не только декоративно-прикладную функцию, но и несет информацию о том, когда, где и при каких условиях была получена награда, а также указывает на социальный статус получателя награды и, в некоторых случаях, даже религиозную принадлежность. Целью данной статьи является рассмотрение русских высших наград как предмета искусства, выявление характерных особенностей и сходных черт в декоративно-прикладном оформлении, а также освещение системы награждения теми или иными знаками отличия. Материал статьи может облегчить творческий поиск материалов по интересующей теме и дать направление для дальнейшего изучения и исследования этого вопроса.

Традиция вручения наград за военные и гражданские отличия существовала на Руси (как, впрочем, и в других странах) с древнейших времен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ